Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (118), 2020

УДК 811.161.3’42:398.91(=161.3)

Рытміка-інтанацыйная арганізацыя беларускага парэмійнага дыскурсу

А.А. Станкевіч

Аналізуецца рыфмарый беларускіх народных прыказак і прымавак і яго роля ў рытміка-інтанацыйнай арганізацыі і выяўленчай выразнасці парэмійнага фонду. Апісваюцца тыпы і віды рыфм па характары канцавога гуку, месцы націску ў сугучных словах, іх часцінамоўнай прыналежнасці, колькасці і якасці сугуччаў зарыфмаваных слоў. Вызначаецца вобразна-асацыяцыйная, выяўленча-выразная і лагічна-выдзяляльная функцыі рыфмы ў правербіяльных выразах.
Ключавыя словы: прыказкі, прымаўкі, парэміі, рыфма, сугучнасць, унутраная, жаночая, мужчынская, дактылічная, адкрытая, закрытая, багатая, бедная, каламбурная рыфмы.

The rhyming of Belarusian Proverbs and sayings and its role in the rhythmic-intonation organization and visual expressiveness of the paremic Fund are analyzed. The types and kinds of rhymes according to the character of the final sound, the place of accent in the consonant words, their part-of-speech facilities, the quantity and quality of concords rhymed words are described. The figurative-associative, figurative-expressive, sense-forming and logical-excretory functions of rhyme in proverbial expressions are determined.
Keywords: proverbs, sayings, pareomia, rhyme, consonance, interior, women, men, dactylic, open, closed, rich, poor, punning rhymes.

Прыказкі і прымаўкі, у якіх адюстроўваецца багаты жыццёвы і працоўны вопыт народа, яго сямейны побыт, эмацыянальна-псіхічны стан, маральна-этычныя і эстэтычныя погляды, займаюць адметнае месца ў сістэме малых жанраў фальклору. У афарыстычнай творчасці беларускага этнасу адлюстраваліся, «як у фокусе, найбольш характэрныя з’явы пэўнага часу – жыццё, быт, культура, думкі і пачуцці народа» [1, с. 291].

Прыказкі і прымаўкі, у адрозненне ад іншых фальклорных жанраў, «не выконваюцца, а ўстаўляюцца ў маўленне ў адпаведнасці з канкрэтнай жыццёвай сітуацыяй як афарыстычнае закончанае суджэнне, праверанае вопытам многіх пакаленняў», якое мае звычайна павучальны змест [2, с. 4]. Правербіяльныя выразы адносяцца да самых дасканалых як па форме, так і па змесце малых фальклорных жанраў. Як адзначаюць даследчыкі, «амаль усе прыказкі <…> вылучаюцца такімі асаблівасцямі, як сцісласць, выразнасць, поўная або частковая вобразнасць, высокія мастацкія якасці» [3, с. 3]. «Прыказка вызначаецца завершанасцю і лаканічнасцю формы, яскравай метафарычнасцю, рытмічнасцю мовы, разнастайнасцю сродкаў мастацкай выразнасці» [4, с. 282].

Апісваючы высокія мастацкія вартасці народнай афарыстыкі, фалькларысты падкрэсліваюць ролю іх рытміка-інтанацыйнай арганізацыі ў стварэнні выяўленчай выразнасці: «мастацкая дасканаласць прыказак і прымавак <..> праяўляецца ў іх кампазіцыі і ў вобразнасці, і ў рытміцы, і ў рыфмоўцы» [1, с. 283]. «Мова прыказкі ў большасці выпадкаў па-мастацку выразная, размераная, складная, нібы вершаваная, яна часта вызначаецца рытмічнай сіметрыяй і ўнутранай рыфмай» [5, с. 47].

Лексіка-семантычныя і сінтаксічныя сродкі выяўленчай выразнасці і слоўнай вобразнасці беларускіх парэмій ужо былі прааналізаваны [6], [7], [8]. Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца апісанне рытміка-інтанацыйнай арганізацыі парэмійнага дыскурсу, вызначэнне тыпаў і відаў рыфмы , іх функцыі і стылістычнай ролі.

Рыфма ў правербіяльных выразах, як правіла, унутраная: *Век звекаваць – не пальцам паківаць* [ПП-2, 406]; *Прыказку скажа , як вузлом завяжа* [ПП-2, 189]. «Унутраная рыфма, у адрозненне ад канцавой, звязвае не радкі, а паўрадкоўі, аднак адыгрывае тую ж рытмічную і кампазіцыйную ролю» [4, с. 152–153].

Асновай рыфмавання ў прыказках і прымаўках, як і ўвогуле ў вершаваным маўленні, з’яўляецца супадзенне націскных галосных: *Бяда за бядою, як рыбка за вадою* [Янк., с. 29]; *Лепш у дзеўках сядзець, чым замужам марнець* [ПП-2, 18]; *Разумны навучыць, а дурань намучыць* [ПП-2, 238].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Узмацняе рыфму супадзенне, акрамя націскога галоснага, паслянаціскных: *Усё зімою згодзіцца, што ўлетку ўродзіцца* [Янк., с. 101]; *Не ўдалося забіць лося* [Янк., с. 225]; *Хоць муж, як лапаць, абы за ім не плакаць* [ПП-2, 60] або пераднаціскных зычных і галосных гукаў: *Лепей жартаваць, чым хвараваць* [Янк., с. 165]; *Удзень цячэ, а ўночы пячэ* [Янк., с. 101]; *Лепей дома касіць, чым у войску ранец насіць* [Янк., с. 48].

У парэміях вызначаюцца розныя тыпы рыфм паводле месца націску адносна парадку складоў ад канца слова, у залежнасці ад характару канцавога гуку ў сугучных словах, колькасці і якасці гукавых супадзенняў, паводле часцінамоўнай прыналежнасці зарыфмаваных слоў.

Як паказвае аналіз фактычнага матэрыялу, у прыказках і прымаўках у колькасных адносінах пераважае жаночая рыфма. У жаночых рыфмах націск падае на перадапошні склад: *У мяне, як у вароны, няма абароны* [Янк., с. 62]; *Сытае бруха да навукі глуха* [Янк., с. 39]; *Якая дошка, такая стружка, якая маці, такая дачушка* [ПП-2, 125].

Мужчынскімі лічацца рыфмы з націскам на апошнім складзе сугучных слоў: *Хоць стой да глядзі,хоць плюнь, да ідзі* [ПП-2, 203]; *Верціць языком, як сабака хвастом* [Янк., с. 288]; *Добра сытага кармі́ць, а голага галі́ць* [Янк., с. 185].

Нярэдка ў парэміях сустракаюцца рыфмы з націскам на трэцім ад канца складзе – дактылічныя: *Багаты дзівіцца, чым бедны жывіцца* [Янк., с. 28]; *Умелая прыказка, як пры мяшку завязка* [ПП-2, 189]; *Першая жоначка, як на небе зорачка, а другая жоначка, як у садзе пчолачка* [Янк., с. 130].

У залежнасці ад характару канцавога гуку сугучных слоў у народных афарызмах выдзяляюцца закрытыя рыфмы, якія заканчваюцца на зычныя гукі: *Часам плачаш, часам скачаш* [ПП-2, 198]; *На губах мёд, а на сэрцы лёд* [ПП-2, 322] і адкрытыя, апошні склад якіх заканчваецца на галосныя, нескладовыя ў, й: *Прыйшла Пакрова – усохла дуброва* [Янк., с. 94]; *Старога паважай, малога павучай* [ПП-2, 132]; *Што целу люба, то душы груба* (ПП-2, 13). У асобных выпадках у парэміях спалучаюцца закрытыя і адкрытыя рыфмы, што стварае розную рытмічную агаласоўку: *Мой хвор мужычок, да красён, як бурачок; а я здарова, да жоўта, як марковa* [ПП-2, 71].

У выключнай большасці правербіяльных выразаў выкарыстоўваецца адкрытая рыфма, што, відавочна, абумоўлена асаблівай складаўтваральнай і рытмастваральнай роляй галосных гукаў, іх меладычнасцю і працягласцю.

Адносна колькасці і якасці гукавых супадзенняў сугучных слоў у народных афарызмах вызначаюцца багатыя рыфмы, у якіх супадаюць многія гукі: *Хоць у кармане пуста, ногі сыплюць густа* [ПП-2, 198]; *Вакол разарэнне: ні табакі, ні карэння* [Янк., с. 30]; *Ёсць дзе сесці, ды няма чаго есці* [Янк., с. 31] і бедныя, калі супадае толькі некалькі гукаў: *Дурны раскідае, а разумны збірае* [ПП-2, 239]; дакладныя, або поўныя рыфмы, у якіх супадаюць націскныя галосныя і паслянаціскныя гукі: *Век пражыць – не кашулю пашыць* [ПП-2, 405]; *Сонца нізка – шабаш блізка* [Янк., с. 98] і недакладныя асанансныя, у якіх супадаюць толькі галосныя: *Дзеці, дзеці, добра з вамі ўлеце, а зімою хоць аб печ галавою* [ПП-2, 116]; *Байка без канца, як кабыла без хваста* [ПП-2, 191] і кансанансныя, калі супадаюць толькі зычныя: *Добрая жонка цяплей за валёнкі* [ПП-2, 66], роўнаскладовыя: *Ні роду, ні плоду – як камень у воду* [Янк., с. 128]; і няроўнаскладовыя: *Як няма шчасця зрання, то не будзе да змяркання* [ПП-2, 425]; апорныя (каранёвыя): *Што бог прызначыць, таго ніхто не перайначыць* [Янк., с. 73]; *Маладому – жонка тлуста, а старому – хлеба луста* [ПП-2, 228] і састаўныя: *Хоць мужык мой з пастол, а я цягну яго за стол* [ПП-2, 60]; *Ці Лявон, ці не Лявон, але з раду не вон* [Янк., с. 73]. Многія з прааналізаваных сугуччаў у парэмійным фондзе маюць багатую, поўную рыфму, што сведчыць аб высокім майстэрстве, адметным таленце і несумненных мастацкіх здольнасцях народных творцаў-складальнікаў прыказак і прымавак.

Рыфма ў парэміях, як і ў паэтычных творах, выконвае важную сэнсаўтваральную і лагічна-выдзяляльную функцыю, яна падкрэслівае, інтанацыйна вылучае пэўныя, важныя для раскрыцця сэнсу выказвання, словы. Паводле часцінамоўнай прыналежнасці сугучных слоў вызначаюцца аднародныя і неаднародныя рыфмы. У прыказках і прымаўках, як правіла, ужываюцца аднародныя рыфмы, у якіх сугучныя словы адносяцца да адной часціны мовы.

Электронный архив ГГУ имени Ф. Скорины

Найбольш часта рыфмуюцца дзеясловы ў асабовай форме: *П'е, як у бочку лье* [Янк., с. 340]; *Язык ляшчыць, як калаўротак трашчыць* [Янк., с. 318]; *Прыказку скажа, як вузлом завяжа* [ПП-2, 189]; *Парожняя бочка звініць, а поўная маўчыць* [ПП-2, 239]; у інфінітыўнай форме: *З жонкай пражыць – не штаны сшыць* [ПП-2, 67]; *Блізка відаць, але далёка дыбаць* [Янк., с. 182]; у форме загаднага ладу: *Калі любіш, то жаніся, а не любіш – аткасніся* [ПП-2, 19]; *Новых сяброў набывай, а старых не забывай* [Янк., с. 69]; *Поле не кляні, а віламі кальні* [ПП-1, с. 123]. Значная перавага дзеяслова ў складзе сугучных слоў абумоўлена тым, што яны ўтвараюць прэдыкатыўнае ядро сказа і з'яўляюцца цэнтрам сінтаксічнай канструкцыі, у якую ўключаюцца іншыя граматычныя класы. Дзеясловы, якія маюць разнастайныя семантычныя адценні, паглыбляюць сэнс афарыстычнага выразу, спрыяюць узмацненню слоўнай вобразнасці і выяўленчай выразнасці парэмійнага маўлення.

У лексічнай парадыгме парэмійнага дыскурсу пэўнае месца займаюць сугучныя субстантыўныя формы, якія выконваюць намінатыўна-сігніфікатыўную функцыю, маюць дакладную прадметна-паняційную суаднесенасць і падкрэсліваюць суб'ект або аб'ект дзеяння: *Не хвалі жонку за цела, а хвалі за дзела* [ПП-2, 68]; *Шукай жонку не на йгрышчы, а на ржышчы* [ПП-2, 27]. Субстантыўную рыфму ўпрыгожвае ўключэнне ў структуру прыказак і прымавак параўнанняў: *Жызь – маліна, а раскусіш – журавіна* [ПП-2, 408]; *Дзяцей, як бобу, а хлеба ні дробу* [ПП-2, 116]; *На Пятра дождж – будзе жыта, як хвошч* [Янк., с. 89]; *Сухі марац, мокры май, будзе жыта, нібы гай* [Янк., с. 98] і фразеалагізмаў: *Жаніўся на скорую руку – на доўгую муку* [ПП-2, 55]; *Акуратніца – відаць серада з-пад пятніцы* [Янк., с. 273], што значна павышае выяўленчую выразнасць парэмійнага тэксту.

Сугучныя прыметнікі ў складзе парэміі, называючы якасці, уласцівасці прадметаў і з'яў, садзейнічаюць іх вобразнай характарыстыцы, ствараюць выразную эмацыянальна-ацэначную канатацыю і значна ўзмацняюць выяўленчы патэнцыял народнай афарыстыкі: *Як кот шкадлівы, а як заяц баязлівы* [Янк., с. 329]; *Хата чужая – як свякруха ліхая* [Янк., с. 40]. Такую ж функцыю выконваюць і дзеепрыметнікі: *Чалавек вучоны як хлеб пячоны* [ПП-2, 178].

Зрэдку сустракаюцца ў парэміях сугучныя займеннікі: *Як абы-які, лепш ніякі* [ПП-2, 21].

Адвербіяльная рыфма выдзяляе акалічнасны дэтэрмінант, падкрэслівае месца, час і спосаб дзеяння: *Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там пуста* [ПП-2, 267]; *Раніцою росна, а ў поўдзень млосна, вечарам камары – і рабіць няма калі* [ПП-2, 270]; *Скочыў далёка, а завяз глыбока* [Янк., с. 97]; *Не скора, да спора* [ПП-1, с. 179].

Даволі разнастайныя ў прыказках і прымаўках неаднародныя рыфмы, у якіх сугучнымі з'яўляюцца словы розных часцін мовы: прыслоўе + назоўнік: *Не чапай ліха, пакуль спіць ціха* [Янк., с. 92]; *Хваліла сябе Сора і сёння і ўчора* [Янк., с. 315]; назоўнік + дзеяслоў: *Хоць муж, як лапаць, абы за ім не плакаць* [ПП-2, 60]; *Наша Хвядора то шые, то пора* [ПП-2, 70]; прыметнік + назоўнік: *Не пытайся, ці галоўка гладка, а пытайся, ці падмеценая хатка* [Янк., с. 91]; займеннік + назоўнік: *Хто з кім, хто з каторай, а я са сваёю Хадорай* [Янк., с. 73]; *Не для нас ананас* [Янк., с. 223]; назоўнік + дзеепрыметнік: *Пытаецца люты, ці добра абуты* [Янк., с. 95]. У кожным з адзначаных відаў неаднароднай рыфмы прысутнічае назоўнік, што светчыць аб важнай рыфмаўтваральнай ролі субстантыўных форм у структуры правербіяльных выразаў.

Як адзначае В.П. Рагойша, «у паэзіі слоўная сугучнасць узнікала найперш у выніку ўжывання сінтаксічнага паралелізму, пры якім у сярэдзіне і на канцах суседніх вершарадоў аказваліся тыя самыя часціны мовы ў аднолькавай граматычнай форме» [4, с. 148–149]. Даволі часта ў парэміях ужываюцца двайныя пары рыфм, што прыводзіць да сінтаксічнага паралелізму: *Як ілгаць, то як кніжку чытаць, а як плаціць, то як дурань стаіць* [Янк., с. 319]; *Як чужое ем, – глух і нем, як маё ядуць, дык слёзы цякуць* [ПП-2, 445]; *Як блізка, то пад вачыма слізка, як далёка, то на сэрцы лёгка* [ПП-2, 65]; *Як у полі асіна – так і сіраціна: яе вецер гне і мачаха б'е* [ПП-2, 102]; *Спасаўка – ласаўка, а пятроўка – галадоўка* [Янк., с. 98]; *Залоўка злая, як свякроўка ліхая* [Янк., с. 120]. Такія сінтаксічныя канструкцыі ствараюць рытмічную сіметрыю і размеранасць структурнага выражэння парэмій.

Асаблівае рытміка-інтанацыйнае афармленне надаюць парэміям ланцужкі рыфм, у якія ўключаюцца тры сугучныя словы, што спрыяе павышэнню выразнасці маўлення: *Стук, грук, абы*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

з рук [Янк., с. 283]; *Якая клёпка, такая й бочка, якая маці, такая й дочка* [ПП-2, 125]; *Ні сюды, ні туды, мае мілыя дуды* [ПП-2, 196]; *Наш Тадэўш – які ядэўш, такі рабатэўш* [Янк., с. 166].

Адметную рыфму ў структуры правербіяльных выразаў стварае сугучча першага і апошняга слова, якое можна абазначыць як кальцавую, апяразаную рыфму, што надае асаблівую складнасць маўленню: *На хаценне ёсць цярпенне* [Янк., с. 110]; *Люты наробіць плюты* [Янк., с. 87]; *Цікавы, як Марцін да кавы* [Янк., с. 298]; *Языком, як цяля хвастом* [Янк., с. 120]. Рыфмаванне пачатковых у радку слоў садзейнічае іх лагічнаму выдзяленню: *Серадзінка, як аўчынка: і летам, і зімой добра* [ПП-2, 484].

Гукавую выразнасць і адметную эмацыянальную канатацыю набываюць рыфмы, у складзе якіх выкарыстоўваюцца анаматапейныя словы і выклічнікі: *Што ўлетку ножкаю коп, тое ўзімку ручкаю хоп* [Янк., с. 105]; *Стук, грук, абы з рук* [Янк., с. 283]; *На спіне шоўк, а ў жываце шчоўк* [ПП-1, с. 230]; *Дзе гам, і я там* [Янк., с. 331]; *Тыц-мыц – няма чаго гаварыць* [Янк., с. 346]; *Танянёх, танянёх, куды кінуў, там і лёг* [Янк., с. 269].

У некаторых выпадках у парэміях дзеля стварэння рыфмы ў адным з сугучных слоў адбываецца змена націску, што набліжае парэмію да каламбурнага выразу: *Каму – як балота, а каму – як залота* [Янк., с. 218]; *Ёсць зубы, ды хлеба няма да губы* [Янк., с. 31]; *Лакомы на чужыя комы, ласы на чужыя каўбасы* [Янк., с. 291]; *Улез у вароны, каркай як ёны* [Янк., с. 72].

Арыгінальнай і каларытнай з'яўляецца рыфма, дзе ў пару сугучных слоў уключаюцца аказіяналізмы, як правіла, субстантыўныя аддзеяслоўныя формы: *Якая кудзеля, такая* ***прадзеля*** [Янк., с. 107]; *Раз* ***кусенькі****, а тры разы* ***хлябенькі*** [Янк., с. 131]; *Хоць які* ***целяпей****, але ўдвух яно ляпей* [Янк., с. 138]; *Учора* ***гоцкі****, сёння* ***гоцкі*** *– будзеш хадзіць без сарочкі* [Янк., с. 270]; *Хто мае* ***пабранкачы****, той мае і* ***паслухачы*** [Янк., с. 73]; *Гаспадарка –* ***клапатарка*** [Янк., с. 78]; *Не дзіва, калі старухі –* ***сварухі*** [Янк., с. 143]; *Любіш быць* ***узяхам****, любі быць і* ***аддахам*** [Янк., с. 333].

Рыфму могуць таксама ўтвараць размоўныя словы, якія надаюць выказванню характар жывой, непасрэднай, спантаннай гутаркі: *Не заўсягды, як на дзяды* [Янк., с. 224]; *Прыйшоў нястатак – забраў астатак* [Янк., с. 94]; *Хоць бы дзеўка не коха, абы грошай панчоха* [Янк., с. 296].

Эмацыянальна-ацэначную афарбоўку надаюць выслоўям рыфмы, у якіх выкарыстоўваюцца формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі з ласкальным: *Родная зямелька – як зморанаму пасцелька* [Янк., с. 59]; *Адзін сынок Юзік, і той – як гарбузік* [Янк., с. 112]; *Добрае слаўцо лепш, чым піўцо* [Янк., с. 153]; *Конік маленькі, але даражэнькі* [Янк., с. 176]; гумарыстычным: *Што гадзінка, то новая прычынка* [Янк., с. 298]; *Што сяльцо, то і нараўцо* [Янк., с. 259] або іранічным адценнем: *Прыбяры пянька, стане за панка* [Янк., с. 177]; *Ні мукі пылінкі, ні солі драбінкі* [ПП-1, с. 221]; *Ходзіць ціхенька, ды думае ліхенька* [Янк., с. 327].

У некаторых выпадках спалучаюцца памяншальна-ласкальныя і павелічальна-зневажальныя формы, што садзейнічае стварэнню кантрасту і ўзмацняе экспрэсію выказвання: *Першая жоначка, як на небе зорачка, а другая жоначка, як у садзе пчолачка, а трэцяя жанішча, як у лесе савішча* [Янк., с. 130].

Такім чынам, як паказвае фактычны матэрыял, у прыказках і прымаўках актыўна выкарыстоўваецца ўнутраная рыфма, разнастайная паводле месца націску, характару канцавога гуку ў сугучных словах, колькасці і якасці гукавых супадзенняў, часцінамоўнай прыналежнасці зарыфмаваных слоў. Яна садзейнічае рытмізацыі парэмійнага маўлення, спрыяе напеўнасці і размеранасці яго выражэння, надае яму складнасць і выразнасць.

Унутраная рыфма ў парэміях выконвае важную сэнсаўтваральную, лагічна-выдзяляльную, вобразна-асацыятыўную, выяўленча-выразную, рытміка-інтанацыйную і мнеманічную функцыі.

Літаратура

1. Фядосік, А.С. Прыказкі і прымаўкі / Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў, А.С. Ліс, А.С. Фядосік, І.К. Цішчанка. – Выд. 3. – Мн. : Выш. школа, 1985. – 749 с.

2. Лепешаў, І.Я. Тлумачальны слоўнік прыказак / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Гродна : ГрДУ, 2011. – 667 с.

3. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік прыказак / І.Я. Лепешаў. – Мн. : Выш. школа, 2014. – 141 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4. Рагойша, В.П. Паэтычны слоўнік / В.П. Рагойша. – Мн. : Выш. школа, 1979. – 320 с.

5. Грынблат, М.Я. Прыказкі і прымаўкі / М.Я. Грынблат // Прымаўкі і прыказкі: ў 2 кн. ; рэд. А.С. Фядосік. – Мн. : «Навука і тэхніка», 1976. – Кн. 1. – 557 с.

6. Станкевич, А.А. Речевые средства создания контраста в белорусских пословицах и поговорках / А.А. Станкевич // Лінгвістичні дослідження : зб. наук. пр. Харк. нац. пед. ун-у ім. Г.С. Сковороди. – Харків, 2016. – Вип. 41. – С. 139–144.

7. Станкевич, А.А. Словообразовательный повтор и его структурно-семантическая роль в белорусских паремиях / А.А. Станкевич // Мова і культура. – 2019. – Вип. 22, т. II (197). – С. 96–100.

8. Станкевіч, А.А. Рытарычныя прыёмы ўзмацнення выяўленчай выразнасці ў беларускім парэмійным дыскурсе / А.А. Станкевіч // Известия Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины. – № 4 (115). Гуманитарные науки. – 2019. – С. 118–123.

Умоўныя скарачэнні

1. ПП-1 – Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах / Рэд. А.С. Фядосік. – Мн. :«Навука і тэхніка», 1976. – Кн. 1. – 557 с.

2. ПП-2 – Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах / Рэд. А.С. Фядосік. – Мн. :«Навука і тэхніка», 1976. – Кн. 2. – 616 с.

3. Янк. – Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Склаў Ф. Янкоўскі. – 3-е выд., дапрац., дап. – Мн. : «Навука і тэхніка», 1992. – 491 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 09.09.2019

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ